№ 12 (125)
снежань

Выдаецца
са студзеня 1993 г.

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

*Пасведчанне
аб рэгістрацыі
№ 411 ад
28 чэрвеня 1996 г.*

Выходзіць 12 разоў
у год (з ліпеня 2003 г.)

НАВУКОВЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ІЛЮСТРАВАНЫ ЧАСОПІС

Заснавальнікі:

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь,
Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі,
Беларускі дзяржаўны універсітэт, Беларускае таварыства «Веды»

*Рэдакцыйная калегія:*

*Галоўны рэдактар Васіль Кушнер*

Сымон Барыс (рэдактар аддзела),Канстанцін Бандарэнка, Пётр Брыгадзін, Рыгор Васілевіч, Максім Гальпяровіч (намеснік галоўнага рэдактара), Анатоль Грыцкевіч, Мікалай Забаўскі, Віктар Іўчанкаў, Аляксандр Каваленя, Міхаіл Касцюк, Уладзімір Клюня, Веньямін Космач, Уладзімір Кошалеў, Надзея Кушнер (рэдактар аддзела), Уладзімір Ладысеў, Рыгор Лазько, Аляксандр Лакотка, Аляксей Літвін, Анатоль Люты, Барыс Ляпешка, Вольга Ляўко, Ігар Марзалюк, Наталля Матусевіч, Аляксандр Радзькоў, Аркадзь Русецкі, Вячаслаў Селяменеў, Аляксандр Смолік, Васіль Стражаў, Сяргей Ходзін, Мечыслаў Часноўскі, Алег Яноўскі, Эдмунд Ярмусік.

*Рэдакцыйная рада:*

Уладзімір Адамушка, Тамара Анціховіч, Юрый Бохан (старшыня рады), Васіль Бушчык, Марыя Бяспалая, Аляксандр Вабішчэвіч, Ала Галубовіч, Надзея Ганушчанка, Уладзімір Гілеп, Аляксандр Груша, Аляксандр Гужалоўскі, Вячаслаў Даніловіч, Таісія Доўнар, Дзяніс Дук, Ларыса Жэрка, Андрэй Каракін, Аляксандр Каханоўскі, Іван Крэнь, Валерый Марозаў, Святлана Марозава, Леанід Мартынаў, Ян Мілеўскі, Антон Міранович, Сяргей Новікаў, Вольга Нячай, Васіль Ракуць, Сяргей Рашэтнікаў, Таццяна Румянцава, Віталь Скалабан, Алег Слука, Мікалай Сташкевіч, Валерый Талкачоў, Уладзімір Тугай, Віктар Фядосік, Анатоль Шаркоў, Захар Шыбека.

## ЗМЕСТ

Слова ад рэдакцыі 3

Гістарычная навука Беларусі на пераломе эпох: выклік часу
*(Выступленне акадэміка-сакратара Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, дырэктара Інстытута гісторыі НАН Беларусі, доктара гістарычных навук, прафесара Аляксандра Аляксандравіча Кавалені на III Міжнародным кангрэсе гісторыкаў Беларусі)* 7

ПАЛІТЫЧНАЯ ГІСТОРЫЯ

Аксана Лепеш — Камітэт заходніх губерняў у Расійскай імперыі другой чвэрці XIX ст. 12

Алена Серак — Парадак і ўмовы ссылкі ўдзельнікаў паўстання 1863—1864 гг. у Беларусі 19

Вольга Гарбачова, Зінаіда Антановіч — Лёсы святароў Магілёўскай і Мінскай рымска-каталіцкіх дыяцэзій пасля паўстання 1863—1864 гг. 23

ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ

Таццяна Літвінава — Творы мастакоў з Польшчы ў Музеі Гомельскага палацава-паркавага ансамбля 29

Алена СЕРАК

# Парадак і ўмовы ссылкі ўдзельнікаў паўстання 1863—1864 гг. у Беларусі

Важным пытаннем у вывучэнні мерапрыемстваў рэпрэсіўнай палітыкі ў адносінах да ўдзельнікаў паўстання 1863—1864 гг. у Беларусі з'яўляецца разгляд умоў этапіравання ссыльных да месца адбывання пакарання.

Сярод першых даследаванняў па гісторыі ссылкі ўдзельнікаў паўстання 1863—1864 гг. у Сібір неабходна адзначыць работу расійскага даследчыка У.Дваранава[1]. Розныя аспекты ссылкі разглядаюцца ў зборніку іншага расійскага гісторыка А.Марголіса, які ўключае артыкулы аўтара за 1975—1994 гг.[2]. Сярод апошніх работ польскіх гісторыкаў па пытаннях знаходжання ссыльных у Сібіры, фарміравання этапных груп, арганізацыі наглядаў і кіравання ссылкай трэба асабліва адзначыць даследаванні В.Сліvoўскай[3].

Яшчэ ў XVII ст. у Расіі былі закладзены асновы сістэмы "безэтапнай" дастаўкі ссыльных, для якой была характэрна нязменнасць канвою на вялікіх адрэзках шляху. Афармленне ж класічнай "этапнай" сістэмы суправаджэння ссыльных пачалося ў 1820-я гг. Сэнсам гэтай сістэмы была рэгулярная змена канвойнай каманды. Пачатак фарміраванню этапнай сістэмы паклала "Высочайше утверждённая ведомость этапам, учреждённым для препровождения арестантов" 1818 г.[4], згодна якой стваралася новая сістэма этапіравання ссыльных па тэрыторыі Расійскай імперыі. Парадак функцыяніравання гэтай сістэмы быў удакладнены ва "Уставе аб ссыльных" 1822 г., дзе былі дэталізаваны пытанні наконт этапіравання ссыльных у Сібір[5].

У выніку маршруты этапіравання арыштантаў як у Сібіры, так і ў Еўрапейскай частцы Расіі былі падзелены на адрэзкі. Звычайна этапы размяшчаліся на адлегласці 40—50 вёрст адзін ад аднаго, а паміж імі знаходзіліся так званыя паўэтапы, якія ўяўлялі сабою месцы начлегу[6]. Такім чынам, у сферы дзеяння адной этапнай каманды знаходзіўся сам этап, а таксама два паўэтапы па абодвух яго баках.

Звычайна ў першы дзень партыя ссыльных рухалася да паўэтапа пад канвоем каманды з папярэдняга этапа. У той жа час насустрач ёй рухалася другая каманда. На паўэтапе адбывалася перадача партыі і начлег. На другі дзень ссыльныя пад канвоем новай каманды рухаліся да этапа. На трэці дзень партыя адпачывала. Такі адпачынак называўся "растаг". На чацвёрты дзень ссыльных канваіравалі да наступнага паўэтапа і перадавалі новай этапнай камандзе. Каманда, якая здала партыю, на пяты дзень вярталася на этап — месца сваёй дыслакацыі. Увесь шосты дзень каманда адпачывала перад прыёмам наступнай партыі.

У 1823 г. па ініцыятыве Сібірскага генерал-губернатара графа М.Сперанскага быў заснаваны прыказ аб ссыльных у Табольску, куды пазней прыбывалі паўстанцы 1863—1864 гг., якія накіроўваліся ў Сібірскую ссылку. Прыказ класіфікаваў ссыльных, вёў поўны запіс,



*СЕРАК Алена Уладзіміраўна — выкладчык кафедры філасофіі і палітологіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага універсітэта, саіскальнік кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтва БДУ. Нарадзілася ў г. Мінск. Закончыла гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Даследуе пытанні сацыяльна-культурнай адаптацыі ссыльных паўстанцаў 1863—1864 гг. у Сібіры. Аўтар каля 10 навуковых публікацый.*

сачыў пры дапамозе падпарадкаваных яму аддзяленняў за далейшай іх перасылкай па Сібіры. Гэтыя аддзяленні атрымалі назвы экспедыцый аб ссыльных і знаходзіліся ў Казані, Пярмі, Табольску, Краснаярску, Іркуцку[7].

Такім чынам, у самім прынцыпе арганізацыі этапнай сістэмы была закладзена абмежаваная прапускная здольнасць, паколькі больш за адну партыю ў тыдзень правесці было практычна немагчыма. Гэта ствярала пэўныя складанасці ва ўмовах масавай высылкі, якая мела месца пасля паўстання 1863—1864 гг. Пры немагчымасці павялічыць колькасць партый заставаўся толькі адзін шлях — павялічыць колькасць людзей у партыі. У адпаведнасці з "Уставам аб ссыльных" летам у адной партыі павінна было быць 60 чалавек, а зімой не больш за 100 чалавек. Аднак, нягледзячы на існаванне жорсткіх абмежаванняў, у Сібіры фарміраваліся партыі з 300—400 чалавек[8]. У 1868 г. енісейскі губернатар паведамляў у рапарце, што "ў партыі, якая складалася са 135 арыштантаў, сем чалавек памерлі, 39 адмарозілі розныя часткі цела, становішча чатырох безнадзейнае, а адзін знік без вестак"[9]. З кнігі запісаў Табольскага прыказа бачна, колькі ссыльных прайшло праз яго за перыяд 1823—1887 гг. — 772 997 чалавек. Нягледзячы на тое, што табольскі астрог быў разлічаны на 500 чалавек, на працягу 1864 года — часу масавага паступлення палітычных ссыльных — у ім набіралася да 2 тыс. чалавек. Табольскі адміністрацыйны апарат не спраўляўся з вялікай колькасцю спраў, таму затрымка ссыльных магла даходзіць да 6—8 месяцаў[10].

Па асноўных пытаннях суправаджэння арыштантаў, як правіла, выдаваліся канкрэтныя інструкцыі і прадпісанні. Так, яшчэ ў 1854 г. былі выдадзены "Особые правила о порядке препровождения в места ссылки политических преступников". Побач з артыкуламі "Устава аб этапах" і "Устава аб ссыльных" менавіта гэтыя правілы былі ўзяты за аснову этапіравання паўстанцаў.

Цікава, што напярэдадні паўстання 1863—1864 гг. у перасыльнай сістэме пачалі адбывацца змены на падставе зацверджанага 18 кастрычніка 1862 г. "Высочайшего положения". У адпаведнасці з ім пешаэтапны парадак руху арыштантаў паміж Вільняй, Псковам і Санкт-Пецярбургам і пешы шлях ад Масквы да Ніжняга Ноўгарада (праз Уладзімір) замяняўся з 1 студзеня 1863 г. перавозкай па Варшаўска-Пецярбургскай і Маскоўска-Ніжагародскай чыгунках[11]. Для канвавіравання арыштантаў па гэтых чыгунках былі сфарміраваны асобыя канвойныя аддзяленні: адно — пры Віленскім батальёне, другое — пры Маскоўскай камандзе ўнутранай варты[12]. Для перавозкі арыштантаў паміж Санкт-Пецярбургам і Вільняй выкарыстоўваліся асобыя вагоны, уладкаванне і далейшае ўтрыманне якіх адбывалася за кошт Галоўнага таварыства расійскіх чыгунак. У гэтых вагонах арыштантаў размяшчалі разам з канвойнымі ніжнімі чынамі, і іх агульная колькасць складала каля 60 чалавек. Паблізу станцый за кошт дзяржаўнага земскага збора ўтрымліваліся асобыя памяшканні для арыштантаў. Правілы, якімі кіраваліся пры прыёме і перадачы арыштантаў на чыгуначнай станцыі, вызначаліся кіраўніцтвам корпуса ўнутранай варты.

Цягнікі з арыштантамі, якія накіроўваліся ў Санкт-Пецярбург, выходзілі з Вільні ў пятніцу і прыбывалі ў Пецярбург у нядзелю. Тут канвойнае аддзяленне заставалася пры Пецярбургскім батальёне ўнутранай варты да наступнай пятніцы, каб забраць партыю з арыштантамі, якія накіроўваліся ў Вільню. На чыгуначную станцыю арыштантаў прыводзілі за паўгадзіны да прыбыцця цягніка. На ўсім шляху яны павінны былі пастаянна знаходзіцца ва ўмацаваных вагонах і не мелі магчымасці пакінуць іх[13].

Паміж Масквой і Ніжнім Ноўгарадам штотыднёва курсіравалі два цягнікі з арыштанцкімі вагонамі — адзін з Масквы ў Ніжні Ноўгарад, другі ў адваротным напрамку. Пры наяўнасці свабодных месцаў у гэтыя вагоны маглі браць людзей са спадарожных гарадоў, якіх таксама трэба было адправіць да месца ссылкі. У выпадку паломкі арыштанцкага вагона арыштантаў маглі перамясціць у пасажырскі альбо таварны вагон. Канвавіраванне арыштантаў на Маскоўска-Ніжагародскай чыгунцы ажыццяўляла спецыяльнае канвойнае аддзяленне, сфарміраванае па распараджэнню ваеннага міністэрства. Яно заўсёды ў поўным складзе суправаджала цягнік, прычым размяшчалася ў вагонах разам з арыштантамі. Уваходзіць у арыштанцкі вагон маглі толькі обер-кандуктары і кандуктары, а таксама кіраўнікі ўнутранай варты і чыгункі.

Харчаванне арыштантаў было даволі абмежаванае. Перад адпраўкай з горада іх кармілі "варывам", а ў дарозе выдавалі па тры фунты хлеба з соллю і паловe фунта варанага мяса ў суткі на чалавека. На харчаванне аднаго арыштанта ў працэсе руху да месца ссылкі па нормах МУС выдзялялася каля 7 капеек у суткі[14].

Асуджаных на высылку паўстанцаў з беларуска-літоўскіх зямель першапачаткова накіроўвалі ў перасыльную турму ў Санкт-Пецярбургу, адкуль потым дастаўлялі на Санкт-Пецярбургскую станцыю Мікалаеўскай чыгункі. Аднак хутка ўлады палічылі такі варыянт нязручным па шэрагу прычын, у першую чаргу з-за недахопу памяшканняў у перасыльнай турме ў Санкт-Пецярбургу. Па прычыне таго, што "павярхоўныя і няпоўныя следчыя справы" не дазвалялі ажыццяўляць далейшы разгляд, следчая камісія ў Санкт-Пецярбургу вымушана была вяртаць іх на месцы для дапаўнення і тлумачэння. Гэта прыводзіла да затрымкі арыштантаў у турме і павелічэння іх колькасці, што, у сваю чаргу, патрабавала дадатковых выдаткаў. Гэты факт неаднаразова адзначаўся ў прадпісаннях міністра ўнутраных спраў да генерал-губернатара Віленскай губерні М.М.Мураўёва[15]. Яшчэ адной прычынай нязручнасці выкарыстання турмы ў Санкт-Пецярбургу з'яўлялася яе аддаленасць ад чыгункі. На сваім шляху да станцыі арыштанты праходзілі па шматлюдных вуліцах і сустракалі самыя розныя адносіны мясцовага насельніцтва. Гэта

пацвярджаецца як архіўнымі матэрыяламі, так і мемуарамі ссыльных. У выніку было зроблена распараджэнне накіроўваць паўстанцаў з заходніх губерняў у Пскоў, дзе ў пачатку 1864 г. для іх былі абсталяваны спецыяльныя памяшканні. У наступным такія перасыльныя пункты для ўсіх асоб, якіх высылалі, былі створаны і ў іншых гарадах Расійскай імперыі. У Пскоў траплялі асобы, высланыя з Царства Польскага і губерняў Віленскай ваеннай акругі. Выключэнне складалі палітычныя злачынцы з Магілёўскай і ўсходняй часткі Віцебскай губерняў, якіх накіроўвалі ў Смаленск. Аднак праблема з недахопам памяшканняў арыштантаў хутка ўзнікла і ў Пскове. У сувязі з гэтым у студзені 1864 г. імператар Аляксандр II выдаў распараджэнне накіроўваць удзельнікаў паўстання 1863—1864 гг. з заходніх губерняў адразу ў Маскву. Пскоў заставаўся зборным пунктам толькі для ссыльных з Царства Польскага[16].

У верасні 1864 г. колькасць асоб, высланых за ўдзел у паўстанні з Царства Польскага, Беларусі, Літвы і Украіны, дасягнула 25 тыс. чалавек. Мясцовыя ўлады не спраўляліся з наглядам за такой колькасцю людзей, у выніку чаго быў выдадзены загад аб спыненні на час масавых ссылак, за выключэннем асаблівых выпадкаў[17]. Да сакавіка 1865 г. у сувязі са скарачэннем колькасці высылаемых паўстанцаў парадак этапіравання ссыльных змяніўся. Было вырашана накіроўваць іх адразу ў месцы ссылкі. Тады ж з'явілася распараджэнне перавозіць палітычных злачынцаў з Царства Польскага і Заходняга краю па Пецярбургска-Варшаўскай чыгунцы не ў асобных цягніках, як гэта было раней, а ў спецыяльных арыштанцкіх вагонах таварных цягнікоў разам з іншымі катэгорыямі злачынцаў[18].

Каштоўныя звесткі аб умовах этапіравання ўтрымліваюцца ва ўспамінах ссыльных. Прыкладам з'яўляюцца ўспаміны Ядвігі Прандоўскай, якая была саслана на жыхарства ў Пермскую губерню. Яна пісала: "Вагон быў чорны, неверагодна брудны, тросся і бразгатаў, як стары хлам, які гатовы вось-вось рассыпацца. Асабліва цяжкая была дарога да Пскова, дзе арыштантаў суправаджалі салдаты канвойных каманд. Кампанія 30 салдат, якія ахоўвалі трох жанчын, была асабліва нясцерпная ноччу. Нягледзячы на наяўнасць маленькага незашклёнага акенца, у вагоне стаяла страшэнная духата, якая ўзмацнялася пахам дрэннай махоркі. Галодныя, напалову п'яныя салдаты падбадзёрвалі сябе крыкам, тупаннем і спяваннем агідна-непрыстойных песенек. Па прыбыцці ў Пецярбург ссыльных перавезлі на іншы вакзал, перасадзілі ў іншы цягнік, вывезлі за горад і пакінулі на тры дні ў чыстым полі. Мучыў голад. Вагоны, быццам збітыя з дошак, прапускалі і снег, і вецер. Подых ператвараўся ў пар, пар кандэнсіраваўся і асыпаў тых, хто знаходзіўся ў вагоне, дажджом. Ногі стаялі ў густой гразі. За каўнер капала. Навокал прасціраўся злавесны пустыр, пакрыты карлікавым хмызняком і кочкамі, якія ўзвышаліся над замерлай трасінай"[19].

Па ўнутраных трактах Віленскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў арыштанты перасоўваліся пешаэтапным парадкам згодна ўсталяванаму маршруту — з Магілёва (праз Оршу) і з Віцебска (праз Гарадок, Невель і Апочку) да Вострава Пскоўскай губерні, альбо з Гродна (праз Ліду) і з Мінска (праз Вілейку і Ашмяны) да Вільні. Далей іх перавозілі чыгуначным транспартам. З Вільні арыштанты накіроўваліся на Дынабург, Рэжыцу, Востраў і Пскоў, а з Пскова ўжо на Санкт-Пецярбург і Маскву па Варшаўска-Пецярбургскай і Маскоўска-Мікалаеўскай чыгунках[20]. У этапным маршруце пазначаліся месцы начлегаў і растагаў, колькасць вёрст ад этапа да паўэтапа, час начлегаў, канвойныя каманды ўнутранай варты. Так, працягласць маршрута з Мінска ў Вільню складала 12 дзён, з іх тры дні вылучаліся на растаг. За дзень перасыльная партыя ў сярэднім праходзіла 23 вярсты[21].

Перамяшчэнне ва ўнутраныя губерні Расійскай імперыі значнай колькасці ссыльных патрабавала стварэння ў перасыльных пунктах спецыяльных памяшканняў для арыштантаў. На галоўных трактах заходніх губерняў былі пабудаваны такія этапныя памяшканні, альбо станцыі для ссыльных. Іх утрыманне бралі на сябе прыватныя асобы. Аднак вынікі рэвізій памяшканняў паказвалі, што стан будынкаў у большасці выпадкаў не адпавядае ўсталяваным патрабаванням. У якасці прыкладу можна прывесці этапнае памяшканне ў м. Должа Віцебскай губерні, на ўтрыманне якога быў заключаны кантракт з памешчыцай Келнц і выдаткавана 60 руб. серабром у год. Нягледзячы на гэта, Далжанскі этапны дом аказаўся непрыгодным для эксплуатацыі: падлога прагніла, на вокнах не было жалезных агароджаў, а на дзвярах — засоваў, у некалькіх месцах праваліўся дах, на браме і веснічках адсутнічаў замок, не было асвятлення і ацяплення. Вартаўнік быў вымушаны сам хадзіць у лес і збіраць буралом для ацяплення[22]. Этап у м. Дыманава Віцебскай губерні ўвогуле размяшчаўся ў прыватным доме, дзе да таго ж знаходзілася карчма. Будынак быў вельмі трухлявы, не мог умясціць і 80 чалавек. Арыштанты былі вымушаны самі збіраць дровы ў лесе для яго ацяплення. Да таго ж, у гэтым перасыльным пункце не было ахоўных прыстасаванняў, што дазволіла двум арыштантам здзейсніць уцёкі[23].

Пэўныя змены ў сістэму этапіравання былі ўнесены згодна палажэнню Камітэта міністраў ад 21 лютага 1864 г. У адпаведнасці з ім, усіх ссыльных з прывілеяваных саслоўяў часова дазвалялася перавозіць на падводах, а таксама накіроўваць у месцы ссылкі на конях за іх кошт. Тых, у каго не было маёмасці, павінны былі адпраўляць на падводах за кошт казны[24]. У сакавіку 1864 г. Аляксандр II зацвердзіў гэты дакумент[25].

У адпаведнасці са спецыяльнымі правіламі, прынятымі 13 ліпеня 1864 г., арыштанты рухаліся з Ніжняга Ноўгарада да Пярмі параходам па Волзе і Каме[26]. Пешаэтапны характар перамяшчэння арыштантаў на гэтым адрэзку шляху быў зменены на перыяд навігацыі перавозкай на спецыяльна зафрахтаваных

параходах і баржах. Пры гэтым у адносінах асоб, якіх высылалі з Царства Польскага і Заходняга краю, дзейнічалі спецыяльныя правілы. Ссыльных прывозілі з Масквы на спецыяльным арыштанцкім цягніку, які прыбываў у Ніжні Ноўгарад штотыднёва па пятніцах. Далей іх размяшчалі на арыштанцкім параходзе, які ішоў у Перм, а ў выпадку яго адсутнасці — на пасажырскім. Арыштанцкі параход адыходзіў адзін раз на два тыдні па серадах. За тыдзень параход дасягаў Пермі і адразу пасля перадачы арыштантаў накіроўваўся ў адваротным напрамку. Пры неабходнасці ён забіраў ніжніх чыноў, якія вярталіся са службы, альбо ссыльных. З Пермі партыі ссыльных адпраўляліся па панядзелках і пятніцах, прычым у пятніцу накіроўваліся асобы, высланыя з Заходняга краю. Пасля спынення навігацыі ўсе арыштанты перамяшчаліся ранейшым сухапутным шляхам. У выніку гэтых новаўвядзенняў у значнай ступені былі палепшаны ўмовы перамяшчэння арыштантаў ад Ніжняга Ноўгарада да Пярмі[27].

У мэтах удасканалення сістэмы сухапутнага перамяшчэння арыштантаў у Сібір былі распрацаваны "Временные правила о сухопутной перевозке арестантов по главному пересыльному тракту от Нижнего Новгорода до Тюмени", якія імператар Аляксандр II зацвердзіў 6 кастрычніка 1864 г.[28]. Паводле гэтых часовых правілаў пешы парадак перасоўвання арыштантаў замяняўся перавозкай пераменнымі конямі, за выключэннем навігацыйнага часу, калі перамяшчэнне адбывалася па воднаму шляху. "Перавозцы на конях падлягаюць усе без выключэння арыштанты, якія рухаюцца цяпер па Ніжагародска-Цюменскаму тракту, як ссыльныя з іх сем'ямі, якія добраахвотна за імі ідуць, так і перасылаемыя паміж гарадамі, што ляжаць на гэтым тракце...". Павозкі альбо калёсы (зімой сані) наймаліся разам з возчыкамі і змяшчалі 4 арыштанты і аднаго канвойнага. Колькасць падвод у абозе залежала ад колькасці арыштантаў і членаў іх сямей. З этапа прадпісвалася выязджаць у 5—6 гадзін раніцы, хуткасць руху павінна была складаць 8 вёрст у гадзіну. Пасля двух гадзін шляху неабходна было зрабіць прыпынак на 10 хвілін[29].

Пазначаным дакументам прапісваўся і парадак руху перасыльнай партыі. Першымі ішлі павозкі з асуджанымі на катаржныя работы. За імі рухаліся ссыльныя на пасяленне з членамі сваіх сямей, наступнымі — сасланыя на жыхарства ў адміністрацыйным парадку, апошнія — павозкі з асобамі прывілеяваных саслоўяў. На прамежкавых станцыях мяняўся канвой, арыштанты перасаджваліся ў новыя павозкі і адразу накіроўваліся далей[30].

Масавая ссылка ўдзельнікаў паўстання 1863—1864 гг. ва ўнутраныя губерні Расійскай імперыі прымусіла ўлады ўнесці змены ў сістэму транспарціроўкі ссыльных да месцаў адбывання пакарання. Пешаэтапны парадак руху арыштантаў паміж Вільняй, Псковам і Санкт-Пецярбургам і пешы шлях ад Масквы да Ніжняга Ноўгарада замяняўся перавозкай па Варшаўска-Пецярбургскай і Маскоўска-Ніжагародскай чыгунках. Адбылося пэўнае паляпшэнне ўмоў этапіравання і на ўчастку Масква—Ніжні Ноўгарад—Казань—Перм. Былі распрацаваны правілы і ўсталяваны час навігацыі і сухапутнай перавозкі, вызначаны парадак прасоўвання перасыльнай партыі, графік руху арыштантаў. Разам з тым, у сістэме этапіравання існавала і мноства праблем, што зніжала яе эфектыўнасць, павялічвала тэрмін знаходжання ссыльных у дарозе. Сярод гэтых праблем найбольш вострымі былі: недахоп памяшканняў у перасыльных пунктах, недахоп транспартных сродкаў, адсутнасць распрацаванага парадку размеркавання і размяшчэння ўдзельнікаў паўстання ў месцах ссылкі. Час, праведзены арыштантамі на шляху да месцаў адбывання пакарання, ператвараўся ў месяцы перасоўвання па этапу пешшу, у арыштанцкіх вагонах, на баржах і падводах. Цяжкасці і нягоды, якія цярпелі арыштанты, прыводзілі да сур'ёзных захворванняў і нават смерці, ператваралі шлях да ссылкі ў дадатковае пакаранне і служылі застрашэннем для іншых.

---

[1] Дворянов В.Н. В сибирской далекой стороне... (Очерки истории царской каторги и ссылки: 60-е гг. XVIII в. — 1917 г.). Мн., 1985.

[2] Марголис А.Д. Тюрьма и ссылка в имперской России: Исследования и архивные находки. М., 1995.

[3] Śliwowska W. Ucieczki z Sybiru. W-wa, 2005.

[4] Полное собрание законов Российской империи (далей — ПСЗРИ). Собр. 1. Т. 35. СПб., 1830. № 27.224, 27.265, 27.255. С. 61—64, 84—88, 95—103.

[5] Устав о ссыльных // Свод законов Российской империи. Т. 14. СПб., 1857. С. 52.

[6] Там жа.

[7] Кеннан Дж. Сибирь и ссылка. СПб., 1906. С. 61.

[8] Там жа. С. 62.

[9] Śliwowska W. Ucieczki z Sybiru. S. 18.

[10] Кеннан Дж. Сибирь и ссылка. С. 62.

[11] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей — НГАБ). Ф. 2648, воп. 1, спр. 223, арк. 1—3.

[12] Там жа. Арк. 1—3.

[13] Там жа. Арк. 4—5, 9.

[14] Там жа. Арк. 21—24.

[15] НГАБ у Гродна. Ф. 3, воп. 1, спр. 1, арк. 33—34.

[16] Кононова Л.П. Ссылка участников польского восстания 1863—1864 гг. (по материалам Архангельской губернии): дис. канд. ист. наук: 07.00.02. Архангельск, 2004. С. 84.

[17] Стшижевская С. Ссыльные участники Январского восстания // Сибирь в истории и культуре польского народа. М., 1999. С. 127.

[18] Кононова Л.П. Ссылка участников польского восстания 1863—1864 гг. (по материалам Архангельской губернии). С. 23.

[19] Prendowska J. Moje wspomnienia. Krakow, 1969. S. 228—342.

[20] НГАБ. Ф. 2648, воп. 1, спр. 223, арк. 11 адв.

[21] Там жа. Арк. 14 адв., 16.

[22] НГАБ. Ф. 2500, воп. 1, спр. 42, арк. 2, 5, 6, 7, 16, 27.

[23] Там жа. Арк. 82, 83, 84, 87, 88.

[24] ПСЗРИ. Собр. 2. Отд. 1. Т. 39. СПб., 1867. № 40619. С. 162—163.

[25] Там жа. № 40657. С. 204.

[26] Там жа. № 41064. С. 598—609.

[27] ПСЗРИ. Собр. 2. Отд. 2. Т. 39. СПб., 1867. № 41329. С. 7—15.

[28] Там жа. С. 7—15.

[29] Там жа. С. 7—10.

[30] Там жа. С. 10—11.